WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

17 ЛІСТАПАДА 2009 г.
АЎТОРАК
№ 217 (26575)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

### Падпіска-2010

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

| індэкс | месяц | квартал | паўгоддзе |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 11660 | 34980 | 69960 |
| 63145 (інд. для ветэранаў ВАВ, пенсіянераў) | 10990 | 32970 | 65940 |
| 63858 (ведамасны) | 18750 | 56250 | 112500 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 17100 | 51300 | 102600 |

Падпіска праз кіёскі і крамы РУП «Белпошта» («Да запатрабавання»)

| | | | |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 10530 | 31590 | 63180 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ, пенсіянераў) | 9860 | 29580 | 59160 |
| 63858 (ведамасны) | 16660 | 49980 | 99960 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 15290 | 45870 | 91740 |

Падпіска праз кіёскі і крамы РУП «Белсаюздрук» («Да запатрабавання»)

| | | | |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 10040 | 30120 | 60240 |
| 63145 (інд. для ветэранаў ВАВ, пенсіянераў) | 9410 | 28230 | 56460 |
| 63858 (ведамасны) | 13494 | 40482 | 80964 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 12779 | 38337 | 76674 |

Заставайцеся з намі!

## «БЕЛЫ БУСЕЛ» ДА КІЕВА ДАВЯЗЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Беларусі з'явіўся 4-ы па ліку фірменны міжнародны хуткі пасажырскі цягнік, які ўчора вечарам, а дакладней у 20 гадзін 50 хвілін адправіўся з Мінска ў Кіеў. Пасля акцыі «Дай цягніку імя» спецыяльнай камісіяй цягніку № 86/85 прысвоена асабістае імя «Белы бусел».

Пасля заканчэння чыгуначнага каледжа тры гады працуе правадніцай Ганна Ташлык (на фотаздымку). Стаць удзельніцай першага рэйса на «Белым буслу» для яе сапраўдная жыццёвая падзея.

## Прамая лінія

## ВРВІ і грып



Прафілактыка і лячэнне вострых рэспіраторных вірусных інфекцый, грыпу, а таксама ўскладненняў, абумоўленых гэтымі захворваннямі, будуць у полі зроку нашай чарговай медыцынскай «прамой лініі». **18 лістапада,** у сераду, на вашы пытанні па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21 **з 14.00 да 15.30** адказа кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры інфекцыйных хваробаў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Святаслаў Алегавіч ВЕЛЬГІН.

**Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.**

## Прамая лінія

## Якім будзе адрас дапамогі?

Новыя ўмовы атрымання адраснай сацыяльнай дапамогі, падтрымка інвалідаў, а таксама ўсе «пенсійныя пытанні» — гэта стане тэмай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ**.

Такім чынам, увага! Паводле папярэдняй дамоўленасці, наша «прамая лінія» пройдзе **8 снежня з 11 да 12 гадзін** па рэдакцыйных тэлефонах: **(8 017) 292 38 21 і 292 38 92**. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары **287 17 57**.

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,

расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 23 НОЯБРЯ 2009 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. О внесении изменений в решение внеочередного Общего собрания акционеров ОАО «АСБ Беларусбанк» от 15.04.2009 г.

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 20 ноября), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 23 ноября) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

**Дата окончания приема бюллетеней – 20 ноября 2009 года.**

**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 84 73.**

УНП 100325912.

## Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з расійскім гісторыкам Роем Мядзведзевым

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 16 лістапада сустрэўся з расійскім гісторыкам, палітолагам Роем Мядзведзевым.**

Рой Мядзведзеў — вядомы эксперт па расійскай гісторыі XX стагоддзя, аўтар больш як 40 кніг па гісторыі, педагогіцы, сацыялогіі, літаратуразнаўству, філасофіі, яго кнігі перакладзены і выдадзены больш як у 20 краінах. Цяпер тэмай яго даследавання з'яўляецца развіццё постсавецкай прасторы, якой ён прысвяціў у апошнія гады шэраг сваіх работ. Гэта тэма і стала галоўнай у час сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі. Роя Мядзведзева цікавіла найноўшая гісторыя Беларусі, мадэль яе сацыяльна-эканамічнага развіцця.

## Спачуванні народу Сербіі ў сувязі са смерцю Святэйшага Патрыярха Сербскага Паўла

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя грамадзян Беларусі і сябе асабіста выказаў шчырыя спачуванні Прэзідэнту Сербіі Барысу Тадзічу, усяму народу Сербіі ў сувязі са смерцю Святэйшага Патрыярха Сербскага Паўла.**

«З глыбокім жалем успрынялі ў Беларусі паведамленне аб смерці Святэйшага Патрыярха Сербскага Паўла, якая стала незаменнай стратай для праваслаўнага свету, — гаворыцца ў спачуванні. — Жыццё Яго Святасці было аддадзена служэнню Богу і Айчыне. Ён быў ініцыятарам і арганізатарам будаўніцтва новых храмаў, натхняў работы па захаванні праваслаўных святынь Косава і Метохіі, актыўна займаўся навуковай і выкладчыцкай дзейнасцю. За гады першасвяціцельства Патрыярх здабыў вялікую павагу адданасцю хрысціянскай веры, сціпласцю, цярпеннем, шчырай любоўю да людзей. Не выпадкова ён стаў сімвалам духоўнага адзінства сербскай дзяржавы».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## «Мокры» нос — наша страхоўка ад пандэмічнага грыпу?

Прыкладна з месяц таму інтэрнэт літаральна выбухнуў навінамі аб дзясятках смяротных ахвяраў свінога грыпу і пнеўманіі ў заходніх рэгіёнах Украіны. Прычым паніка, якая суправаджала эпідэмічны пад'ём, распаўсюджвалася нават больш імкліва, чым грыпозная хваля. Таму паліцы ўкраінскіх, беларускіх і расійскіх аптэк апусцелі літаральна ў імгненне вока. А самым дэфіцытным таварам сталі ў аптэках супрацьвірусныя сродкі і медыцынскія маскі. Затое цяпер, калі паніка пайшла на спад, медыкі раптам прызналі, што была рэальная карысць ад таго, што страх прымусіў усіх мабілізавацца і падрыхтавацца да сустрэчы з небяспечнымі вірусамі. Так, кіраўнік місіі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ва Украіне Юка Пукіла заявіў, што «ёсць інфармацыя, якая пацвярджае распаўсюджванне эпідэміі ва Украіне з захаду на ўсход, прычым, згодна з высновамі эпідэміёлагаў, **прычынай далейшага распаўсюджвання грыпу можа стаць у тым ліку і адсутнасць панікі**». Можна меркаваць, што спадар Пукіла меў на ўвазе знікненне насцярожанасці ў людзей, якія проста сталіся за сябе хвалявацца. Тым часам колькасць смяротных выпадкаў ад грыпу і вострых вірусных інфекцый павялічылася ва Украіне да 300 чалавек. А колькасць жыхароў Украіны, уцягнутых у эпідэмію, перавысіла 1 млн 365 тысяч чалавек. Эпідэмічны парог не перавышаны пакуль толькі ў Днепрапятроўскай, Адэскай, Харкаўскай, Херсонскай абласцях, у Крыме і ў Севастопалі.

СТАР. 2

## Да ведама

## СТАРШЫНЯ ДЗЯРЖКАНТРОЛЮ НА «ПРАМОЙ ЛІНІІ»

**НА гэты раз падзяліцца з Зянонам Кузьмічом Ломацем інфармацыяй аб наяўных праблемах, неналежным выкарыстанні дзяржсродкаў і ўласнасці, выпадках незахавання заканадаўства службовымі асобамі арганізацый і прадпрыемстваў розных формаў уласнасці змогуць жыхары сталіцы і Мінскай вобласці.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Камітэта дзяржкантролю, «прамая лінія» пройдзе 19 лістапада з 15.00 па 17.00. Кіраўнік галоўнай кантрольнай установы краіны будзе чакаць званкоў па мінскім тэлефоне 210 01 65. Прычым Зянон Ломаць гатовы выслухаць не толькі паведамленні аб парушэннях у дзейнасці суб'ектаў гаспадарання, але і прапановы, накіраваныя на паляпшэнне эканамічнай сітуацыі ў сталіцы, Мінскай вобласці, наогул ва ўсёй краіне. Як падкрэсліваюць у КДК, кожнае паведамленне, што паступіць на «прамую лінію», будзе праверана, а прапановы прааналізаваныя.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ПРЫРОСТ НАСЕЛЬНІЦТВА ЗА 9 МЕСЯЦАЎ ЗАФІКСАВАНЫ Ў 57 ГАРАДАХ І 18 ГАРПАСЁЛКАХ

**Колькасць насельніцтва Беларусі на 1 кастрычніка гэтага года склала 9 млн. 664,1 тыс. чалавек, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. За студзень-верасень гэтага года жыхароў рэспублікі стала менш на 7,8 тыс. чалавек.**

За дзевяць месяцаў 2009 года ў краіне нарадзілася 82,9 тыс. дзяцей (на 2,3 тыс. больш, чым за дзевяць месяцаў 2008 года), памерлі 99,7 тыс. чалавек (на 0,2 тыс. больш). Агульны паказчык нараджальнасці вырас з 11,1 на 1000 насельніцтва да 11,5, а паказчык смяротнасці насельніцтва павялічыўся з 13,7 да 13,8. Натуральны прырост насельніцтва за студзень-верасень гэтага года зафіксаваны ў 57 гарадах са 112 (50,9 працэнта) і ў 18 пасёлках гарадскога тыпу з 94 (19,1 працэнта). Натуральны прырост сельскага насельніцтва адзначаны толькі ў Мінскім (0,5 тыс. чалавек) і Брэсцкім (36 чалавек) раёнах.

**БЕЛТА.**

## НОВЫ ФАСОНЧЫК

Ну, няма ў нас на кінафестывалі чырвонага дывана, па якім зоркі, каб сябе паказаць, прыгожа і важна прайшлі б да залы... І не трэба! Мінск бярэ не гэтым. У нас зоркі могуць паказаць сябе не дзе-небудзь, а на сцэне. Ці размаўляць могуць прама з вамі — з экрана, паўстаючы ўсё ў новых вобразах. Ёсць фестывалі, куды прыязджаюць не пакрасавацца, а таму, што ёсць такая справа — ствараць кіно і належаць да яго свету.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Расціслаў ЯНКОЎСКІ адкрывае фестываль.

Сёлета шаноўных гасцей на «Лістапад» прывялі справы. Артыст Аляксандр Дамагараў, напрыклад, адзначыў, што некаторыя фестывалі разглядаюць як лёгкае баўленне часу. А для некаторых гэта — праца. Прынамсі, ён у Мінск прыехаў, каб прадстаўляць фільм «Цар», дзе артыст іграў ролю галоўнага апрычніка. Леанід Ярмольнік надоўга не затрымаўся — на наступны дзень пасля адкрыцця фестывалю правёў свой феерычны майстар-клас і засяпшаўся дадому. Легенда еўрапейскага кіно рэжысёр Кшыштаф Занусі лічыць сустрэчы ў Мінску карыснымі і ахвотна дзеліцца сваімі думкамі — гэта для яго вельмі прыемная частка працы дзеля кіно. Рэжысёр Павел Чухрай быў засяроджана-стрыманы — будзе працаваць увесь фестывальны тыдзень старшынёй прафесійнага журы. Наталля Варлей, у якой вялікая частка кінагледачоў праз шмат гадоў бачыць няўрымслівую Ніну, зараджала аптымізмам — паглядзіш на яе і адразу верыш у вечную любоў. Аднак і яна выходзіла на сцэну, каб праспяваць песню на ўласныя словы. Расійская актрыса Настасся Макеева прыехала — і таксама спявала, і Андрэй Анкундзінаў спяваў на адкрыцці фестывалю...

СТАР. 5



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Сёлета спецыяльны прыз Прэзідэнта Беларусі «За захаванне і развіццё духоўных каштоўнасцяў у мастацтве» атрымаў народны артыст Беларусі Генадзь ГАРБУК.

## ГЭТЫ ТЫДЗЕНЬ БУДЗЕ ЦЁПЛЫМ І ДАЖДЖЛІВЫМ

Удзень 17 лістапада атмасферны фронт прынясе дажджы ў многія раёны рэспублікі. У начныя і ранішнія гадзіны зноў згусцяцца туманы, на асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны будзе вагацца ад 3 градусаў марозу да 4 градусаў цяпла, а ўдзень яна складзе 2—8 градусаў вышэй за нуль. Дажджлівым чакаецца надвор'е і ў наступныя дні тыдня. Месцамі магчымы туманы. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 1 да 8 градусаў цяпла. Удзень ад плюс 3 да 10 градусаў. У выхадныя атмасферны ціск пачне расці, аднак у вільготных паветраных масах месцамі чакаюцца невялікія дажджы, зноў згусцяцца туманы.

**БЕЛТА.**

## 1 КГ ГЕРАІНУ — 10 ГАДОЎ УЗМОЦНЕНАГА РЭЖЫМУ



Суд г. Жодзіна Мінскай вобласці прызнаў непрацуючага 27-гадовага жыхара горада вінаватым у незаконным набыцці, захоўванні, перавозцы, збыце асабліва небяспечнага наркатычнага рэчыва ў буйным памеры і прызначыў яму 10 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. Упраўленне КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці вызначыла, што падазроная асоба намерана рэалізаваць буйную партыю гераіну, які захоўваўся ў тайніку ляснога масіву на тэрыторыі Мінскага раёна. У момант збыту наркотыку ў Жодзіне зламыснік быў затрыманы аператыўнай групай чэкістаў і байцамі «Альфы». Падчас вобыску аўтамабіля быў знойдзены скрутак вагой каля 1 кг. Па заключэнні хіміка-крыміналістычнай экспертызы ў скрутку аказаўся гераін. Мінімальны кошт канфіскаванай партыі наркарэчыва на чорным рынку складае каля 20 тысяч долараў у выпадку аптовага продажу і звыш 60 тысяч долараў пры рэалізацыі фасаваных дозаў для разавага ўжывання. Гэта самая буйная партыя гераіну, канфіскаваная праваахоўнымі органамі Беларусі ў гэтым годзе.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## АБРАБАВАЎ КРАМУ, УЗБРОІЎШЫСЯ... КАМЕНЕМ

У Мар'інай Горцы ў нядзелю днём злачынца напаў на 27-гадовага прадаўца крамы, каб разжыцца спіртным і закускай. А палове чацвёртай дня невядомы мужчына, што знаходзіўся ўнутры крамы, раптоўна ўдарыў жанчыну каменем па галаве і адкрыта выкраў бутэльку гарэлкі, бутэльку віна і прадукты харчавання на 25 тысяч рублёў. Праз 45 хвілін пасля здарэння пацярпелая звярнулася па дапамогу. Учыніў злачынства 59-гадовы вясковец, які раней быў судзімы за наўмыснае знішчэнне маёмасці і ўхіленне ад утрымання дзяцей.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ЗАБОЙСТВА РАСКРЫТА ПА ГАРАЧЫХ СЛЯДАХ

Раскрыта забойства пажылой жыхаркі Драгічынскага раёна. Пра гэта паведаміла старшы памочнік пракурора Брэсцкай вобласці Вольга Дзмітрук. «13 лістапада ў 14.30 па месцы жыхарства ва ўласнай хаце ў вёсцы Гутава быў знойдзены труп жанчыны 1924 года нараджэння, якая пражывала адна. Цялесныя пашкоджанні, што меліся на трупе, давалі падставу меркаваць, што было ўчынена забойства. Загінулая была задушана», — расказала Вольга Дзмітрук.

Па падазрэнні ва ўчыненні гэтага злачынства затрыманы мясцовая непрацуючая жыхарка, раней судзімая за збыт наркотыкаў, і яе знаёмая, таксама непрацуючая, грамадзянка Расіі.

**БЕЛТА.**

## САЛЁНАЕ СРЭБРА

Студэнт паказаў Еўропе язык



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Учора лепшаму танцору, абсалютнаму чэмпіёну Беларусі па бальных танцах Андрэю Кіцуну (на фотаздымку) споўнілася васямнаццаць гадоў. А пазаўчора ён стаў срэбным прызёрам Еўропы. Вядома ж, гэты тытул ён здабыў не адзін, а ў пары з Юліяй Крапчук. Мінскі танцавальны дуэт упершыню ўзняў спартыўную Беларусь на гэткі высокі п'едэстал. Падзея адбылася ў мінулыя лістападаўскія выхадныя на міжнародным турніры «Беларусь Open-2009». Андрэй — студэнт універсітэта фізічнай культуры, Юлія — мінская школьніца. Перамога, як яны прызнаюцца, далася нялёгка: былі і гузакі, і салёны пот, і слёзы за ўпушчанае першае месца. Праз месяц моладзевая пара паедзе ў Рыгу змагацца за званне чэмпіёнаў свету. Пажадаем Андрэю і Юліі, а таксама іхнім трэнерам Паўлу Ярцаву і Марыне Баслык новых перамог на танцавальным паркеце!

СТАР. 8

## БІТВА ЗА ВІЛЬНЮ

### Беларускі тайбаксёр збіў лепшага ўдарніка Літвы на вачах у гледачоў перапоўненай «Сімэнс Арэны»

**УЛЕТКУ мінчанін Забіт Самедаў і літовец Міндаўгас Сакалаўскас ужо сустракаліся. Тады суддзі прызначылі дадатковы раўнд, каб вызначыць лепшага. І Забіт Самедаў адзінагалосна перамог. Той паядынак праходзіў у Польшчы.**

На гэты раз у Вільні літоўцы, безумоўна, разлічвалі на перамогу свайго байца. Двубой Самедава і Сакалаўскаса быў адным з двух цэнтральных паядынкаў байцоўскага шоу пад назвай Heroes.

Галоўная спартовая пляцоўка Літвы, «Сімэнс-Арэна», вечарам у мінулую суботу была папросту перапоўнена гледачамі, прыйшло восем тысяч чалавек. Нават на баскетбольныя матчы літоўскай зборнай часам столькі балельшчыкаў не прыходзіць. Усе ахвотныя так і не змясціліся, хоць білеты каштавалі на беларускія грошы ад 50 да 400 тысяч рублёў.

СТАР. 2



Літоўскаму суперніку даставалася і рук, і ног, але ён здолеў дастаяць да канца двубоя.

**Беларуская каманда не магла выехаць з тэрыторыі спартовай пляцоўкі на банкет больш за гадзіну, прыхільнікі Забіта нават з «чорнага ўвахода» здолелі прабрацца ў распранальню байца.**

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «БЕЛОРУССКИЙ НАРОДНЫЙ БАНК»

30 ноября 2009 года в 10.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров Открытого акционерного общества «Белорусский народный банк».

**Повестка дня общего собрания:**

1. О проведении дополнительной эмиссии акций банка путем закрытой подписки.

Внеочередное общее собрание акционеров состоится в помещении ОАО «БНБ-Банк» по адресу: 220012, г. Минск, пр-т Независимости, 87А.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 25 ноября 2009 г.

С информацией, относящейся к вопросам, включенным в повестку дня, акционеры могут ознакомиться в приемной ОАО «БНБ-Банк» в период с 17 ноября 2009 г. по 30 ноября 2009 г., в рабочие дни с 9.00 до 17.00 (перерыв с 12.45 до 13.30).

Регистрация акционеров по месту проведения собрания с 9.00 до 10.00 по документу, удостоверяющему личность, а представителей акционеров — юридических лиц — по доверенности.

УНП 100513485

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.11.2009 г. (для б/н разлікаў)

| Валюта | Курс |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 720,00 |
| ▲ 1 еўра | 4 074,00 |
| 1 латвійскі лат | 5 746,28 |
| 1 літоўскі літ | 1 178,76 |
| 1 чэшская крона | 159,75 |
| 1 польскі злоты | 994,61 |
| ▲ 1 расійскі рубель | 94,87 |
| 1 украінская грыўня | 334,46 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

| Валюта | Курс |
|---|---|
| USD | 28,6705 |
| UAH | 35,3142 |
| 1000 BYR | 10,5251 |
| EUR | 42,9541 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 ад 03.05.2004 да 02.05.2009

ISSN 1990 - 763X

Рой МЯДЗВЕДЗЕЎ:

# «БЕЛАРУСЬ — АПОШНЯЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ КРАІНА Ў ЕЎРОПЕ»

**ЗНАКАМІТЫ палітолаг, аўтар чатырох дзясяткаў кніг па расійскай і савецкай гісторыі, Рой Мядзведзеў прыехаў у Беларусь і меў двухгадзінную размову з Аляксандрам Лукашэнкам самнасам. Размовай з беларускім Прэзідэнтам Рой Аляксандравіч застаўся задаволены:**

— Мы гутарылі з Прэзідэнтам дзве гадзіны. Безумоўна, уражанні самыя станоўчыя, таму што гэта была сапраўды гутарка. З лідарамі вельмі цяжка гутарыць. Адзін лідар задае пытанне, слухае адказ і кажа «дзякуй і да пабачэння». Такі лідар, напрыклад, Барыс Ельцын. Ёсць іншыя лідары, якія самі задаюць пытанне і самі на яго адказваюць. Гэта, напрыклад, Гарбачоў. Ёсць трэці тып лідара, які здольны да гутаркі, бо яму цікава меркаванне суразмоўцы. Але ёсць яшчэ больш рэдкі тып лідара, які яшчэ і хоча растлумачыць суразмоўцу свой пункт гледжання. Аляксандр Рыгоравіч — апошні тып лідара, ён не толькі з інтарэсам слухаў тое, што кажу я, але і спрабаваў некаторыя рэчы мне растлумачыць. Для пісьменніка — гэта лепшы характар сустрэчы. Я задаволены ёй, практычна на ўсе пытанні, якія я спадзяваўся задаць Прэзідэнту, я атрымаў станоўчыя адказы.

Дарэчы, Рой Аляксандравіч на працягу пяці гадоў піша кніжку пра Беларусь. Ужо нават прыдуманая для яе назва — «Беларуская крэпасць». У ёй будзе 6 раздзелаў, прынамсі, будзе напісана пра беларускую эканамічную мадэль, пра адносіны Беларусі з суседзямі і іншымі краінамі, а таксама асобны раздзел будзе прысвечаны Аляксандру Лукашэнку. Паколькі кніга яшчэ задумвалася і пачынала пісацца да сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу, то пра Беларусь у час крызісу будзе сказана асобна ў заключэнні.

— У прадмове да кнігі пра Беларусь я напісаў, — расказвае Рой Мядзведзеў, — што Беларусь знаходзіцца ў асаблівым становішчы: з 21 краіны, якія з'явіліся на працягу 20 гадоў ад распаду Югаславіі, Чэхаславакіі, Савецкага Саюза, толькі Беларусь адзіная захавала сацыялістычны выбар, не стала ламаць сістэму, якая склалася, а захавала пераемнасць з мінулай савецкай сістэмай. Аляксандр Рыгоравіч мне сёння пацвердзіў, праўда, з агаворкамі, што ён таксама лічыць, што Беларусь можна назваць сацыялістычнай краінай. Паколькі гэта адзіная такая краіна ў Еўропе, то, з аднаго боку, гэта ставіць Беларусь у прывілеяванае становішча, а з іншага боку, стварае цяжкасці, якія і дазваляюць назваць мне кнігу «Беларуская крэпасць», бо гэта не падабаецца ні Расіі, асабліва чыноўнікам маскоўскім, ні, зразумела, Захаду. Я чалавек пішучы, я не палітык, але ў друку я нідзе не сустракаў пазітыўных артыкулаў пра Беларусь, акрамя газеты «Советская Россия».

У час гутаркі ў рэдакцыі «Беларусь сегодня» Рой Аляксандравіч прызнаўся, што ў Мінску ён першы раз і яшчэ не паспеў адчуць, што знаходзіцца ў іншай краіне. А інфармацыю пра Беларусь, у тым ліку і для кнігі, ён бярэ з пісьмовых крыніц. Прынамсі, на працягу 5 гадоў чытае 5 беларускіх газет.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Парламенцкі дзённік

## ЁСЦЬ НАД ЧЫМ ПРАЦАВАЦЬ

**НА пасяджэнні Прэзідыума верхняй палаты парламента былі ўнесеныя дапаўненні ў парадак дня трэцяй сесіі. 19 лістапада сенатарам прапануецца разгледзець сем пытанняў. Сярод іх — тры законапраекты, ратыфікацыі трох міжнародных пагадненняў і дэкрэт кіраўніка дзяржавы, — паведаміў віцэ-спікер Анатоль РУБІНАЎ.**

Членаў Савета Рэспублікі чакае разгляд законапраекта аб асновах дзяржаўнай моладзевай палітыкі. Нагадаем, што дакумент замацоўвае аспекты развіцця валанцёрскага руху, стварэння студатрадаў, шматпрофільных цэнтраў па рабоце з моладдзю. Праектам закона прадугледжваецца ўвядзенне адпаведнай пасады ва ўстановах — спецыяліста па рабоце з моладдзю. Чакаецца, што яго прыняцце будзе садзейнічаць максімальнай рэалізацыі патэнцыялу маладых беларусаў.

Падчас пасяджэння старшыня Савета Рэспублікі Барыс БАТУРА выказаўся аб неабходнасці дапрацоўкі законапраекта аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва (нядаўна прыняты дэпутатамі ў першым чытанні. — **Аўт.**). Паводле меркавання спікера, яго трэба зрабіць грунтоўна ліберальным, ён павінен прадугледжваць кардынальныя змены. Палітык адзначыў, што наконт дакумента выказана мноства істотных крытычных заўваг. Барыс Батура таксама звярнуў увагу на праблему адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення — шмат пытанняў узнікае адносна ўзбуйнення сельсаветаў. Спікер узняў пытанне, наколькі гэта аб'ектыўна ў наяўнай сітуацыі. Вырашэнне праблемы досыць актуальнае напярэдадні мясцовых выбараў і, адпаведна, фарміравання выбарчых акруг.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

# «Мокры» нос — наша страхоўка?..

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А ў Беларусі, як запэўніваюць у Міністэрстве аховы здароўя, захваральнасць насельніцтва на грып і вострыя рэспіраторныя інфекцыі працягвае зніжацца. Так, аналіз паказчыкаў захваральнасці за папярэдні тыдзень сведчыць, што колькасць зваротаў хворых з сімптомамі прастуды змяншалася штодня ў сярэднім на 15—17 працэнтаў. За тыдзень захваральнасць насельніцтва знізілася ў кантрольных гарадах больш як на 50 працэнтаў. У сталіцы за апошні тыдзень у медустановы звярнуліся больш як 49 тысяч захварэлых з прастуднымі сімптомамі, што таксама менш у параўнанні з папярэднім тыднем, калі было зарэгістравана 64 669 зваротаў. Як ужо паведамлялася раней, з 12 лістапада быў адноўлены вучэбны працэс у мінскіх агульнаадукацыйных установах, аднак некаторыя навучальныя ўстановы горада цяпер знаходзяцца на каранціне ў сувязі з вялікай колькасцю захварэлых навучэнцаў. Каранцінныя меры, нагадаем, уводзяцца тэрмінам на 7 дзён, калі па прычыне прастуды адсутнічаюць 30 і больш працэнтаў ад агульнага кантынгенту навучэнцаў і персаналу. Так, да 17 лістапада спынены вучэбны працэс у Рэспубліканскай гімназіі-каледжы пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і ў «БІП — інстытуце правазнаўства». Да 20 лістапада — у сярэдніх школах № 63 і № 70. І з 16 па 22 лістапада — у спецыяльнай агульнаадукацыйнай школе № 18.

На канец тыдня колькасць ахопленых супрацьгрыпознымі прышчэпкамі мінчан перавысіла ўжо 182 тысячы чалавек. За кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту былі прышчэпленыя асобы з так званых груп рызыкі. А за кошт сродкаў гарадскога бюджэту ажыццяўлялася вакцынацыя выхаванцаў дашкольных устаноў, вучняў мінскіх школ і прадстаўнікоў прафесій, якія адказваюць за жыццядзейнасць горада (камунальных службаў, службаў энерга- і водазабеспячэння і грамадскага транспарту). З выкарыстаннем вакцын «Ваксігрып» (Францыя) і «Флюарыкс» (Германія), набытых за сродкі мясцовага бюджэту, былі прышчэпленыя больш як 61 тысяча дзяцей і 25 тысяч дарослых. Цяпер у паліклініках горада засталіся толькі адзінкавыя дозы вакцыны, прызначаныя для завяршэння вакцынацыі супраць грыпу дзяцей ва ўзросце да 9 гадоў, якія прышчапляюцца ўпершыню, а таксама асобаў з груп рызыкі, якім па стане здароўя немагчыма было зрабіць прышчэпку раней.

За кошт уласных сродкаў пажадалі прышчапіцца каля 7 тысяч мінчан. І 45 тысяч чалавек былі прышчэпленыя за кошт сродкаў прадпрыемстваў і арганізацый. Арганізавалі вакцынацыю сваіх работнікаў кіраўнікі больш як 650 сталічных арганізацый і прадпрыемстваў.

Між іншым, днямі была агучана сенсацыйная выснова, да якой прыйшлі адначасова некалькі груп еўрапейскіх спецыялістаў, прычым незалежна адна ад другой. На думку даследчыкаў, распаўсюджванню ўзбуджальніка грыпу A/H1N1 на тэрыторыі Еўропы перашкаджае рынавірус, які выклікае запаленне слізістай абалонкі носа і праяўляецца ў нас у выглядзе насмарку. Жан-Себасцьян Касаленьё з Ліёнскага ўніверсітэта (Францыя) заўважыў, што захваральнасць на грып у краіне павысілася ў пачатку верасня, а затым знізілася да ўзроўню 160 захварэлых на 100 тысяч насельніцтва, на якой і заставалася да канца кастрычніка. А ў лістападзе захваральнасць зноў пачала расці. Па словах французскага спецыяліста, зніжэнне ўзроўню захваральнасці на грып супала з ростам колькасці запаленняў слізістай носа, якія выклікаюцца рынавірусамі. Мія Брытынг са Шведскага інстытута па кантролі за інфекцыйнымі захворваннямі таксама заўважыла рост інфіцыравання рынавірусамі і адначасовае зніжэнне захваральнасці на грып напрыканцы жніўня ў Швецыі. Аналагічную карціну ў жніўні назіраў і супрацоўнік аўстралійскага ўніверсітэта Квінсленда Ян Макей, а таксама даследчыкі з Нарвегіі. Усе яны ў адзін голас сцвярджаюць, што пацыенты з рынавіруснай інфекцыяй у меншай ступені падвержаны заражэнню іншымі рэспіраторнымі віруснымі захворваннямі. Пік захваральнасці рынавіруснай інфекцыяй у паўночным паўшар'і звычайна прыпадае на канец лета ці пачатак восені, у той час як узбуджальнікі грыпу найбольш актыўныя ў зімовы перыяд. Аднак эпідэмія грыпу распачалася сёлета ў Еўропе раней чым звычайна, што і прывяло да сутыкнення ўзбуджальнікаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Абзац

◢ Дзесяць жыхароў Віцебска шпіталізаваныя, яшчэ 15 атрымліваюць амбулаторна прышчэпкі супраць шаленства з-за ўкусаў бяздомнага сабакі. Чорны сабака сярэдніх памераў пачаў атаку на гараджанаў звечара і працягваў яе ўвесь наступны дзень, кусаючы людзей на розных вуліцах горада. Людзі пачалі звяртацца ў траўмапункт, у выніку прышчэпкі былі прызначаныя 25 гараджанам, з якіх 10 шпіталізаваныя. Камунальныя службы пачалі адлоў бадзяжных сабак, і толькі ўвечары 15 лістапада ім удалося злавіць жывёліну, падобную, па апісанні, на тую, што пакусала людзей. Лабараторныя матэрыялы пасланыя на даследаванне.

**◢ Міністэрства аховы здароўя Беларусі прыняло рашэнне перанесці на вясну наступнага года рэспубліканскі з'езд фармацэўтаў, які быў намечаны на 23—24 лістапада г.г. Гэта зроблена згодна з рэкамендацыямі міжведамаснага каардынацыйнага савета па прафілактыцы грыпу.**

◢ Сяржант тэрміновай службы пацярпеў на вучэбных стрэльбах у Гродне. НЗ адбылося ў 6-й асобнай мехбрыгадзе на Фолюшы. 20-гадовы вайсковец трэцяга перыяду тэрміновай службы парушыў меры бяспекі. У момант, калі праводзіўся стрэл з ручнога супрацьтанкавага гранатамёта РПГ-7В, ён перамяшчаўся без дазволу старшага камандзіра і апынуўся на небяспечнай адлегласці ззаду. Хлопец пацярпеў ад гарачага выхлапу і пыжа. З траўмамі твару (рванымі ранамі сківіцы) ён быў дастаўлены ў медыцынскую ўстанову, дзе яму зрабілі аперацыю. Праводзіцца праверка.

## Поўны абзац

**◢ У Севастопалі пажаніліся поўныя цёзкі. У Аляксандра і Аляксандры Валабуевых аказаліся аднолькавымі не толькі імёны і прозвішчы, але і адна на дваіх вуліца, школа і ўніверсітэт. Нават нарадзіліся яны ў Севастопалі ў 1985 годзе. Жылі цёзкі на адной вуліцы, у суседніх дварах, а іх кватэры размяшчаліся на шостым паверсе. Пазнаёміліся Валабуевы па інтэрнэце. У ЗАГСе, куды яны прыйшлі падаваць заяву, не абышлося без казусаў. Сутыкнуўшыся з Аляксандрамі Валабуевымі, ды яшчэ з практычна аднолькавымі адрасамі, супрацоўнікі ЗАГСа вымушаны былі дэталёва правяраць, ці не з'яўляюцца яны раднёй.**

◢ У Данецку ў пятніцу, 13-га, прайшоў чэмпіянат па паяданні часнаку, цыбулі і перцу пад назвай «Стоп, грып!» Спачатку на хуткасць трэба было з'есці адну цыбуліну, затым — галоўку часнаку, папярэдне абабраўшы зубкі. Не дазвалялася глытаць іх, трэба было старанна пераЖоўваць. І калі з першым заданнем справіліся многія, бар'ер з часнаком і перцам перакрочылі нямногія. У фінале за прыз у 1000 грыўняў змагаліся дзяўчына Аліна і студэнт Аляксандр. Фіналістам трэба было на хуткасць з'есці два перцы-чылі. У выніку прызавыя ім давялося падзяліць паміж сабой — перац яны з'елі за 26 секундаў.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*



Забіт Самедаў (злева) не пакінуў Сакалаўскасу ніводнага шанцу.

# БІТВА ЗА ВІЛЬНЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— *Для мяне важна пабаксіраваць у гэтым горадзе. З гісторыі я ведаю, што Вільня — гэта гістарычная сталіца беларускай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага,* — выказаўся **Забіт САМЕДАЎ** «Звяздзе» перад выхадам на двубой. — *Ведаю, што каманда Сакалаўскаса марыць перамагчы. Але я не пакіну ім шанцу*.

На дзіва, у пачатку двубоя «Сімэнс-Арэна» не выбухнула крыкамі ў падтрымку літоўскага байца, як гэта здаралася ў паядынках з расіянамі. Многія, вядома, падтрымлівалі Сакалаўскаса, але частка залы крычала за Самедава.

Літовец паспрабаваў адбіць нашаму байцу нагу, але Забіт удала заблакаваў усе атакі і сам перайшоў у наступленне. Моцным правым ударам мінчанін патрапіў літоўцу па корпусе, а потым правёў сакрушальную серыю ў галаву. Стала зразумела, што Сакалаўскас не здолее нічога супрацьпаставіць. Тым не менш хоць і моцна збітым, але літовец здолеў дастаяць да канца двубоя. Суддзі адзінагалосным рашэннем аддалі перамогу Забіту Самедаву.

—*Забіт — адзін з самых папулярных байцоў свету, мы разлічваем на тое, што пасля гэтага двубою нас запросяць на фінальнае Гран-пры К-1 у Токіа,* — расказвае пра найбліжэйшыя планы **Дзмітрый ПЯСЕЦКІ**, трэнер Забіта Самедава. — *З сотняў тысяч прафесійных байцоў на фінальнае Гран-пры трапляюць адзінкі. Японцы днямі прагледзяць відэа гэтага паядынку, і стане вядома, ці запросяць нас у Токіа*.

Пасля двубоя Забіт Самедаў выйшаў у хол «Сімэнс-Арэны», каб выпіць гарбаты. Тут жа байца ўзялі ў ачапленне гледачы з трыбунаў, выстраілася чарга па аўтографы. Беларуская каманда не магла выехаць з тэрыторыі спартовай пляцоўкі на банкет больш за гадзіну, прыхільнікі Забіта нават з «чорнага ўвахода» здолелі прабрацца ў распранальню байца.

Забіт Самедаў — азербайджанец па паходжанні, аднак з дзяцінства жыве ў Мінску. Байцом экстра-ўзроўню з нуля яго зрабіў беларускі трэнер. У мінулым сезоне Забіт перамог зорку К-1 Рэя Сэфа і сам здабыў сусветную вядомасць. Забіту за яго эфектную тэхніку далі мянушку «Маўглі». На турнірах К-1, дзе збіраюцца лепшыя байцы свету з усіх ударных відаў спорту, Самедаў зазвычай самы маленькі спартоўца (вага каля 93 кг). Супернікі ж трапляюцца па 110, 120, 130 кг і больш. Тым не менш мінчанін удала змагаецца з гігантамі.

**P.S.** ***Эксклюзіўныя фотаздымкі з турніру можна паглядзець на сайце www.zviazda.by.***

**Яўген ВАЛОШЫН.**

## Футбол

### АМАЛЬ ТАВАРЫСКАЯ НІЧЫЯ

Зборная Беларусі ў суботу згуляла ўнічыю таварыскі матч у гасцях з камандай Саудаўскай Аравіі — 1:1. Беларусы забілі на 20-й хвіліне — вызначыўся Максім Бардачоў. А на 23-й хвіліне з поля быў выдалены наш галкіпер Юрый Жаўноў, і на 32-й хвіліне гаспадары зраўнялі лік.

### АДЗІН МЯЧ ПЕРАВАГІ

У суботу ў Еўропе адбыліся першыя гульні стыкавых матчаў за права паездкі на чэмпіянат свету па футболе 2010 года.

Зборная Расіі дома прымала каманду Славеніі і перамагла з лікам 2:1, хоць на апошніх хвілінах госці ледзь не вырвалі для сябе нічыйны вынік. Каманда Украіны гасцявала ў віцэ-чэмпіёнаў Еўропы зборнай Грэцыі і згуляла ўнічыю — 0:0. Партугалія дома з лікам 1:0 абыграла Боснію і Герцагавіну, а французы ў гасцях з такім жа лікам перамаглі ірландцаў. Як бачна па выніках, барацьба ў стыкавых матчах ідзе не на жарт, больш чым у адзін мяч гаспадары дома переваrі не мелі. Зрэшты, канчаткова ўсё вырашыцца ў сераду ў матчах у адказ. Таксама адбыўся першы стыкавы матч у Лацінскай Амерыцы паміж камандамі Коста-Рыкі і Уругвая, дзе таксама з мінімальнай перавагай выйгралі госці.

А каманды Новай Зеландыі і Бахрэйна, як прадстаўнікі адпаведна Акеаніі і Азіі, ужо ў другой стыкавай гульні вызначылі ўладальніка яшчэ адной пуцёўкі ў ПАР. Пасля безвыніковай нічыі ў Бахрэйне, новазеландцы забілі дома адзіны мяч у гульні, які і дазволіў ім праз 27 гадоў зноў трапіць на чэмпіянат свету.

### «ДЫНАМА» ВЫЙГРАЛА КУБАК ПАЛЕССЯ

У Пінску прайшоў традыцыйны футбольны турнір Кубак Палесся, у якім бяруць удзел у асноўным маладыя гульцы. Пераможцамі сталі мінскія дынамаўцы, якія выйгралі ўсе тры сустрэчы: дынамаўцы абыгралі пінскую «Хвалю» (4:0), салігорскі «Шахцёр» (1:0) і барысаўскі БАТЭ (5:1). Другое месца ў барысаўчан, якія абыгралі салігорскіх футбалістаў (2:1) і пінчан (2:0).


## ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

(организатор аукциона) 30 ноября 2009 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит открытый аукцион по продаже имущества, находящегося в республиканской собственности

На аукционные торги выставляются:

**Лот № 1.** Киоск из металлоконструкций (инв. № 170-18), расположенный по адресу: Минская область, г. Дзержинск, пер. 1-й Ленинский, 1, общей площадью 6,2 кв. м, длиной – 2,7 м; высотой – 2,6 м; шириной – 2,3 м. Стены, крыша, двери – металлические, потолок – металлический, ДСП, пол – доска. Год ввода в эксплуатацию – 2002.

**Начальная цена предмета торга по лоту № 1 составляет** 2 158 478 рублей. **Размер задатка** – 200 000 рублей.

**Лот № 2.** Аптечный киоск № 1 (инв. № 91-180), расположенный по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Тавлая, 9, общей площадью 11,1 кв. м. Аптечный киоск – 3х3,3; высота 3,5 м из стали ст.3, утепл. каркас металл. профиль, наружная отделка – панели металлопластик, внутренняя отделка – ламинированная ДСП, утеплители 120VFZ, остекление витрин – однокамерный стеклопакет. Витрины защищены пакетами профиль АК-45. Вдоль витрин укреплены прилавки. Электропроводка открытого исполнения, устройство защитного отключения УЗО, автомат защиты, счетчик, светильники. Предназначен для организации мелкорозничной торговли из помещения на одно рабочее место. Год ввода в эксплуатацию – 2002.

**Начальная цена предмета торга по лоту № 2 составляет** 2 586 896 рублей. **Размер задатка** – 200 000 рублей.

**Продавец:** Торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Минская Фармация», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел. 224 57 01, 224 46 31.

Задаток перечисляется в срок по 27 ноября 2009 года на расчетный счет **№ 3642900000841** в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество».

**Подробное извещение о проведении аукциона** опубликовано в газете «Звязда» от 11 сентября 2009 г. № 171.

Фотографии продаваемых объектов, а также информация об объявленном аукционе и предметах аукциона дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома: **www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество» в разделах «Власть», «Управления и комитеты облисполкома».

**ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:**

1. Подписать протокол о результатах аукциона.
2. В течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов перечислить в республиканский бюджет сумму фактических затрат на организацию и проведение торгов, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.
3. Подписать договор купли-продажи не позднее 25 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона при предъявлении копий платежных документов, подтверждающих перечисление суммы возмещения расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона.
4. Произвести оплату за конкретный предмет торга в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Аукцион проводится в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов в республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30 марта 2009 г. № 36.

Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала проведения аукциона по каждому объекту, выставляемому на аукцион.

Фонд «Минскоблгосимущество» имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения. Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 320, тел. 224 39 76, 500 47 10.** Последний день подачи заявок **27 ноября 2009 г. до 17.00.**



Минский городской центр недвижимости

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ 08.12.2009 г.

**Фонд «Минскгоримущество» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят повторно открытый аукцион по продаже объектов коммунальной собственности г. Минска**

| | Лот № | 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Наименование и местонахождение объекта, тип и характеристика помещения** | Не завершенный строительством объект – «Помещение предприятия бытового обслуживания № 1 в 9-этажном крупнопанельном жилом доме со встроенными помещениями № 6 по генплану. Микрорайон «Михалово-1» (ул. Янки Брыля, 24) | Не завершенный строительством объект – «Встроенные помещения № 1, № 2 для работы с населением в 9-12-этажном жилом доме по генплану № 36 в микрорайоне «Сухарево-2» (ул. Лобанка, 81) | Не завершенный строительством объект – «Магазин непродовольственных товаров в 9-этажном крупнопанельном жилом доме со встроенными помещениями № 6 по генплану. Микрорайон «Михалово-1» (ул. Я. Брыля, 24) | Не завершенный строительством объект – «Магазин промышленных товаров в жилом доме № 2 по генплану со встроенными помещениями. Жилой район Дружба. Микрорайон Дружба-3 (1-я очередь строительства), (ул. Наполеона Орды, 37) |
| 2 | **Общая площадь* (м.кв.)** | 263,17 | 387,00 | 907,05 | 1203,60 |
| 3 | **Начальная цена продажи (руб.)** | 450 000 000 | 620 000 000 | 1 144 438 709 | 2 000 000 000 |
| 4 | **Сумма задатка (руб.)** | 45 000 000 | 62 000 000 | 114 438 709 | 200 000 000 |
| 5 | **Сроки оплаты объекта** | Оплата за объект производится в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. | | | |

* Сведения о площадях объектов, не завершенных строительством, даются на основании проектно-сметной документации.

1. Повторный аукцион состоится **8 декабря 2009 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.
2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка в сумме 10 % начальной цены лота предоставляются в УП «Минский городской центр недвижимости» одновременно с документами, необходимыми для участия в аукционе. Денежные средства перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк», по Минской области, код 153001331, УНП 190398583.
3. Победителем торгов по каждому лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену.
4. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукциона. Оформление акта землепользования производится Покупателем.
5. Победитель аукциона в сроки, указанные в протоколе о результатах аукциона, обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов при заключительной регистрации под роспись.
6. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 7 декабря 2009 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Подробная информация о проведении аукциона опубликована в газете «Звязда» от 04.08.09 № 143, 26.08.09 № 159.

**Телефон для справок: 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by**



## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 22 декабря 2009 года проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в Минском районе

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 | Лот 7 | Лот 8 | Лот 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Адрес земельного участка** | Минский район, Хатежинский с/с, район деревень Хатежино – Новая Веска | Минский район, район деревень Дегтяревка, Таборы | Минский район, Новодворский с/с, вблизи автодороги М-4 Минск–Могилев на 14 км (право) | Минский район, Мачулищанский с/с, г.п. Мачулищи | Минский район, Ждановичский с/с, п. Ратомка | Минский район, Папернянский с/с, д. Семково | Минский район, Щомыслицкий с/с, д. Новый Двор | Минский район, Колодищанский с/с, п. Колодищи | Минский район, Колодищанский с/с, п. Колодищи |
| 2 | **Кадастровый номер** | 623687500001000100 | 623681700001000357 | 623684300001000329 | 623655500001000303 | 623681708601002213 | 623685500001000418 | 623688000001000345 | 623683403101006208 | 623683403101006115 |
| 3 | **Площадь земельного участка** | 14,9999 га | 30,0012 га | 10,0000 га | 0,5004 га | 0,8501 га | 45,2011 га | 0,6652 га | 0,0299 га | 0,1069 га |
| 4 | **Срок аренды (лет)** | 51 | 51 | 49 | 51 | 40 | 99 | 51 | 51 | 50 |
| 5 | **Целевое назначение** | Для строительства логистического центра | Для строительства логистического центра с комплексом складских сооружений | Для строительства гипермаркета с многофункциональной направленностью | Для строительства производственно-складских и технических сооружений для производства изделий медицинского назначения | Для строительства физкультурно-оздоровительного комплекса | Для строительства спортивно-туристического комплекса с объектами соцкультбыта | для строительства производственной базы | под установку торгового павильона | под строительство торгового объекта |
| 6 | **Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей)** | 1 863 552 538 | 3 179 682 753 | 1 014 340 173 | 8 487 405 | – | 2 654 730 955 | – | – | – |
| 7 | **Расходы по подготовке документации (рублей)** | 6 449 085 | 4 006 284 | 3 623 656 | 1 827 820 | 2 151 045 | 5 887 558 | 1 464 266 | 560 062 | 1 287 967 |
| 8 | **Начальная цена права заключения договора аренды** | 359 028,60 доллара США, возможно предоставление рассрочки | 718 090,71 доллар США, возможно предоставление рассрочки | 1 052 744 доллара США, возможно предоставление рассрочки | 35 851,36 доллара США | 33 676,20 доллара США | 10 315 381 доллар США, возможно предоставление рассрочки | 31 174,40 доллара США | 2 680,36 доллара США | 16 820 265 белорусских рублей |
| 9 | **Задаток (рублей)** | 60 000 000 | 120 000 000 | 180 000 000 | 10 150 000 | 9 540 000 | 2 900 000 000 | 8 400 000 | 700 000 | 1 600 000 |

| | | Лот 10 | Лот 11 | Лот 12 | Лот 13 | Лот 14 | Лот 15 | Лот 16 | Лот 17 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Адрес земельного участка** | Минский район, Колодищанский с/с, п. Колодищи | Минский район, Колодищанский с/с, п. Колодищи | Минский район, Хатежинский с/с, д. Хатежино | Минский район, Колодищанский с/с, д. Юхновка | Минский район, Колодищанский с/с, д. Юхновка | Минский район, Мачулищанский поссовет, г.п. Мачулищи | Минский район, Сеницкий с/с, д. Урожайная | Минский район, Острошицко-Городокский с/с, д. Марьяливо |
| 2 | **Кадастровый номер** | 623683403101006116 | 623683403101006193 | 623687508101000738 | 623683405101000704 | 623683405101000705 | 623655500001000322 | 623686600001000220 | 623685204101000537 |
| 3 | **Площадь земельного участка** | 0,0347 га | 0,1500 га | 0,0600 га | 0,0520 га | 0,0264 га | 1,9998 га | 1,6808 га | 0,0015 га |
| 4 | **Срок аренды (лет)** | 30 | 50 | 51 | 50 | 30 | 51 | 71 | 50 |
| 5 | **Целевое назначение** | под строительство магазина розничной торговли с пристроенным кафе-пиццерией | для строительство кафе и магазина под непродовольственную группу товаров | для строительства кафе | для строительства торгового объекта | под установку павильона по ремонту обуви | под строительство производственно-складских и технических сооружений для пищевого производства | для строительства гостиницы на 100 мест с рестораном на 150 мест | для установки торгового павильона |
| 6 | **Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей)** | – | – | – | – | – | – | – | – |
| 7 | **Расходы по подготовке документации (рублей)** | 572 754 | 602 755 | 661 464 | 737 562 | 548 309 | 3 084 162 | 833 751 | 548 309 |
| 8 | **Начальная цена права заключения договора аренды** | 4 468 676 белорусских рублей | 18 573,42 доллара США | 2 571,98 доллара США | 4 475,90 доллара США | 1 165,45 доллара США | 405 042 583 белорусских рубля | 429 842 445 белорусских рублей | 256,77 доллара США |
| 9 | **Задаток (рублей)** | 400 000 | 5 000 000 | 600 000 | 1 200 000 | 300 000 | 40 000 000 | 42 000 000 | 60 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **22.12.2009 г. в 9.00.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 100. Окончание приема заявлений и документов **16.12.2009 г. в 17.00.** Контактный телефон (8 025) 92 761 92.

Задаток перечисляется на р/с 3641000233719, отделение № 537, г. Минск ОАО «Белинвестбанк», МФО 153001739, УНП 600068187, получатель – Минский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, и расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем в течение 2-х рабочих дней после внесения им всех причитающихся платежей.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается не состоявшимся в случаях если: заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками; ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем.

Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:

1. заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков,
2. заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
